Прэзыдэнта абяруць не пазьней за 8 лютага 2011 году

«Народная воля» ў шапіках

Апазыцыя абмеркавала, як будзе жыць далей

Замест грошай МВФ — чарговыя перамовы

У Віцебску маладыя будуць пачынаць сямейнае жыцьцё ў дзіцячым доме

«Be2gether» абапал мяжы

Найбольш сур'ёзныя наступствы фінансавага крызысу Беларусь адчуе ў лютым — сакавіку 2009 году. Так мяркуе адмысловец Інстытуту эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук прафэсар Аляксандар Лучанок. «Стаіць задача сур'ёзнага рэфармаваньня ўсіх нашых падыходаў, сацыяльных стратэгіяў, пунктаў погляду дзеля выжываньня ў цяперашніх эканамічных умовах», — цытуе экспэрта БелаПАН.

Тым часам урад спрабуе дамовіцца з МВФ пра крэдыт на 2 мільярды даляраў дзеля ўтрыманьня фінансавай стабільнасьці. Місія МВФ працавала ў Менску з 27 кастрычніка па 23 лістапада. Аднак рашэньне пытаньня «даваць ці не даваць пазыку» адкладзенае. Місія вернецца ў Менск у сярэдзіне сьнежня.

Паводле выцечак інфармацыі, адной з умоў выдзяленьня крэдыту МВФ назваў дэвальвацыю беларускага рубля на 20%.

Аднак гэта наўрад ці прымальна для беларускага боку. Стабільны курс беларускага рубля ўзьведзены прапагандай у культ. Рост сярэдняга заробку беларусаў традыцыйна


photo.bymedia.net

вымяраецца ў даляравым эквіваленце. Аляксандар Лукашэнка ставіў задачу да канца 2010 году давесьці паказчык да 700—1000 даляраў на месяц (зараз — блізу 450). У выпадку значнай дэвальвацыі гэтыя пляны абрынуцца, кіраўнік дзяржавы атрымае рэпутацыйную страту.

Зь іншага боку, дэвальвацыя, на думку экспэртаў, паспрыяла б беларускім экспартэрам. Зараз краіна мае вялікае адмоўнае сальда замежнага гандлю.

На 28 лістапада афіцыйны курс складаў 2156 беларускіх рублёў за даляр ЗША. Да канца году паводле зацьверджаных прэзыдэнтам парамэтраў курс мусіць вагацца ў межах 2100—2200 рублёў за даляр ЗША, у 2009 годзе павінен знаходзіцца ў калідоры плюс-мінус 5% ад курсу на 1 студзеня.

Разам з тым Нацыянальны банк не выключае перагляду курсавай палітыкі ў выпадку пагаршэньня замежнаэканамічнай сытуацыі. Пра гэта заявіў намесьнік кіраўніка Нацбанку Павал Калаўр, выступаючы ў Палаце прадстаўнікоў 27 лістапада.

Між тым ужо дакладна вядома, што з 2009 году беларускі рубель будзе прывязаны не да даляра ЗША, як было раней, а да кошыка валют. У яго будуць уваходзіць даляр, эўра і расейскі рубель. Кіраўніцтва Нацбанку тлумачыць такое рашэньне тым, што апошнім часам дынаміка курсу даляра да эўра стала непрадказальнай. Незалежныя экспэрты лічаць пераход да кошыка валют станоўчым для эканомікі краіны.

Фінансава-эканамічныя цяжкасьці змушаюць уладу паскараць

працэс эканамічнай мадэрнізацыі. Міністэрства эканомікі распрацавала праект адпаведнай дзяржаўнай комплекснай праграмы.

«Мы ня выжывем безь інвэстыцыяў, бяз новых вытворчасьцяў», — заявіў прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі на пасяджэньні прэзыдыюму Савету міністраў 26 лістапада. Кіраўнік ураду жорстка скрытыкаваў органы дзяржаўнага кіраваньня за бюракратызм і цяганіну ў працы з замежнымі інвэстарамі.




Тым часам адмыслоўцы раяць скараціць бюджэтнае субсыдаваньне прамысловых прадпрыемстваў. «Трэба паглядзець, якія прадпрыемствы працуюць нерэнтабэльна, і зачыніць іх. Гэта прывядзе да росту беспрацоўя, але практыка сьведчыць, што лепш выплачваць дапамогі па беспрацоўі, чым утрымліваць заводы, прадукцыя якіх пастаянна стратная», — заяўляе прафэсар Лучанок.

У кантэксьце эканамічных праблемаў ды ціску з боку Расеі спакусьлівай для Менску выглядае сьвежая прапанова Эўракамісіі: далучыцца да пагадненьня аб асацыяцыі і супольным рынку. Дзеля гэтага спатрэбіцца пераняць усе заканадаўчыя акты Эўразьвязу ды прызнаць юрысдыкцыю Эўрапейскага суду.

Эўракамісія мае намер прапанаваць такое пагадненьне шасьці постсавецкім краінам — Азэрбайджану, Армэніі, Беларусі, Грузіі, Малдове і Ўкраіне. Чакаецца, што 3 сьнежня прапанова Эўракамісіі будзе афіцыйна абнародаваная, а 11 сьнежня — улучаная ў палітыку ЭЗ на Эўрапейскім саміце кіраўнікоў краін аб'яднанай Эўропы. Фактычна гэта ёсьць развіцьцём польска-швэдзкай ініцыятывы «Усходняе партнэрства». Бюджэт праекту складзе 2,1 млрд эўра.

Міністар замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў прыхільна адгукнуўся пра «Ўсходняе партнэрства». Разам з тым экспэрты мяркуюць, што тут у беларускага кіраўніцтва могуць узьнікнуць палітычныя засьцярогі. Яно хоча зладзіць аўтарытарную мадэрнізацыю, не чапаючы сутнасьці палітычнага рэжыму. Ангажаваньне ж у агульнаэўрапейскія працэсы вымагае пэўных крокаў і ў галінах дэмакратыі, правоў чалавека, грамадзянскіх свабодаў.

У прыватнасьці, каб прадэманстраваць Эўразьвязу прагрэс у гэтых галінах, Менск паабяцаў распачаць дыялёг з АБСЭ ў пытаньнях удасканаленьня Выбарчага кодэксу, вярнуць у нацыянальную сыстэму распаўсюду газэты «Народная воля» ды «Наша Ніва», улічыць меркаваньне незалежнай мэдыйнай супольнасьці пры распрацоўцы захадаў у пытаньні заканадаўчага рэгуляваньня інтэрнэту.

«Інтэрнэт у Беларусі ёсьць і будзе свабодным», — заявіў кіраўнік галоўнай ідэалягічнай управы Адміністрацыі прэзыдэнта Ўсевалад Янчэўскі на круглым стале «Інтэрнэт-мэдыі: выклікі XXI стагодзьдзя» 24 лістапада ў Менску. Арганізатарамі дыскусіі выступілі АБСЭ і Міністэрства інфармацыі.

Са свайго боку, намесьнік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэй Бастунец раскрытыкаваў улады за намер «знайсьці дадатковы мэханізм кантролю над інтэрнэт-рэсурсамі, распаўсюдзіўшы на іх дзеяньне нормаў закону аб СМІ». Гэты закон, прыняты ўлетку, утрымлівае рэпрэсіўныя нормы і не адпавядае стандартам АБСЭ.

26 лістапада кіраўніцтва Беларускай асацыяцыі журналістаў сустрэлася з галоўным дзяржаўным ідэолягам У. Янчэўскім. Абмяркоўваліся праблемы свабоды слова, стварэньня болей цывілізаваных умоў для незалежных СМІ. У прыватнасьці, ішла гаворка пра неабходнасьць вяртаньня ўсіх недзяржаўных выданьняў у нацыянальную сыстэму распаўсюду. Па выніках сустрэчы кіраўніца БАЖ Жанна Літвіна выказала стрыманы аптымізм.

Тым часам два апальныя брэнды — «Народная воля» і «Наша Ніва» — вось-вось зьявяцца ў шапіках. Выданьні падпісалі адпаведныя дамовы. Яны таксама ўлучаныя у паштовыя каталёгі. Варта нагадаць, што шэраг недзяржаўных грамадзка-палітычных выданьняў былі выдалены з нацыянальнай сеткі распаўсюду перад прэзыдэнцкімі выбарамі 2006 году



і з таго часу ладзяць распаўсюд саматужна.

Зараз, на думку аналітыкаў, улада ідзе на частковыя саступкі дзеля нармалізацыі дачыненьняў з Эўразьвязам. Беларуская дэмакратычная супольнасьць падкрэсьлівае, што ў гэтым працэсе важна, каб ЭЗ быў прынцыповы і не задавальняўся імітацыяй грамадзка-палітычнай адлігі.

Беларуская апазыцыя тым часам прааналізавала ўрокі мінулай парлямэнцкай кампаніі на канфэрэнцыі ў Вільні 21—22 лістапада. У выніку гарачай дыскусіі бальшыня ўдзельнікаў прыйшла да высновы: варта захаваць шырокую кааліцыю ды вылучыць адзінага дэмакратычнага кандыдата на наступных прэзыдэнцкіх выбарах. Пра намер балятавацца на іх днямі ў інтэрвію «Франс-Прэс» заявіў і дзейны кіраўнік дзяржавы.

На думку незалежных экспэртаў, ва ўмовах крызысу і змушанай трансфармацыі беларускай мадэлі апазыцыйны кандыдат мусіць узняць лёзунг пераменаў. Палітолягі параілі тытульным апазыцыянэрам «шукаць беларускага Абаму».

АФІЦЫЙНА

## Прэзыдэнта абяруць не пазьней за 8 лютага 2011 году

***Скрайнія тэрміны правядзеньня чарговых мясцовых і прэзыдэнцкіх выбараў — 14 сьнежня 2010 году і 8 лютага 2011 году, паведаміў БелаПАН сакратар ЦВК Мікалай Лазавік.***

Паводле Канстытуцыі выбары праводзяцца не пазьней чым за два месяцы да заканчэньня тэрміну паўнамоцтваў папярэдняга прэзыдэнта. Прэзыдэнт уступіў у паўнамоцтвы 8 красавіка 2006 году, нагадаў Лазавік, так што выбары павінны адбыцца не пазьней за 8 лютага. Сакратар ЦВК, аднак, адзначыў, што раней устаноўленых тэрмінаў выбары праводзіць можна.


photo.bymedia.net

ПАЛІТЫКА

## «Народная воля» ў шапіках

***Абяцаньні сталі практыкай. Беларусы могуць набываць незалежную газэту «Народная воля» ў шапіках. Першыя асобнікі ў кіёсках «Белсаюздруку» зьявіліся 27 лістапада, а чарговы нумар выйшаў накладам 11 тысяч асобнікаў.***



У сваю чаргу, продаж «Нашай Нівы» ў шапіках плянуецца ад наступнага нумара, які выйдзе 3–4 сьнежня.

На абодва незалежныя выданьні можна падпісацца.

АПАЗЫЦЫЯ

## Апазыцыя абмеркавала, як будзе жыць далей

***У Вільні 21—22 лістапада адбылася канфэрэнцыя, прысьвечаная сытуацыі на Беларусі пасьля парлямэнцкіх выбараў у верасьні бягучага году.***

У канфэрэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі грамадзкасьці, палітычных партыяў, недзяржаўных арганізацыяў, незалежныя экспэрты.

Упершыню пасьля завяршэньня выбарчай кампаніі грамадзянская супольнасьць абмеркавала агульную стратэгію дзеяньняў апазыцыі на пэрыяд да прэзыдэнцкіх выбараў 2010 году.

Удзельнікі канфэрэнцыі горача спрачаліся пра магчымыя мэханізмы вылучэньня адзінага кандыдата на прэзыдэнта краіны, неабходнасьць вылучэньня такога кандыдата, а таксама магчымасьць дыялёгу зь беларускім рэжымам у новых умовах.

Сустрэча ў Вільні была арганізаваная дзякуючы намаганьням Савету Эўропы і парлямэнцкай групы літоўскага Сойму «За дэмакратычную Беларусь».

ЭКАНОМІКА

## Замест грошай МВФ — чарговыя перамовы

***Місія Міжнароднага валютнага фонду працягне кансультацыі з уладамі***

***Беларусі па пытаньні даваньня крэдыту stand-by ў намеры два мільярды даляраў у сьнежні, паведамляе «Радыё Свабода».***



Паводле прэсавага рэлізу Нацыянальнага банку Беларусі, у сьнежні бакі абмяркуюць «пытаньні, якія маюць тэхнічны характар». Таксама ўдакладняецца, што ў адпаведнасьці зь дзеючай у МВФ працэдурай «пасьля ўзгадненьня ўсіх тэхнічных пытаньняў адпаведны пакет дакумэнтаў будзе прадстаўлены выканаўчай радзе МВФ для канчатковага зацьверджаньня».

Беларусь зьяўляецца сябрам МВФ ад 1992 году. За пэрыяд супрацоўніцтва Беларусь атрымала ад МВФ 2 траншы крэдыту па праграме сыстэмнай трансфармацыі ў жніўні 1993 году ($98 мільёнаў) і ў лютым 1995 году ($101,7 мільёнаў), а таксама адну траншу крэдыту stand-by ў верасьні 1995 году ($101,7 мільёнаў). Пасьля гэтага фонд болей не выдаваў крэдыту Беларусі, бо эканамічная палітыка краіны не адпавядала рэкамэндацыям гэтай міжнароднай арганізацыі.

ГРАМАДЗТВА

## У Віцебску маладыя будуць пачынаць сямейнае жыцьцё ў дзіцячым доме

***Стварыць новую традыцыю, зьвязаную з рэгістрацыяй шлюбу, вырашыла віцебская абласная арганізацыя Чырвонага Крыжа. Кіраўнічка арганізацыі Галіна Жаланава хоча ўвесьці традыцыю дарыць маладым цацкі замест кветак для таго, каб адразу пасьля ЗАГСу яны адвезьлі тыя цацкі ў падарунак у дзіцячыя дамы, паведамляе «Эўрарадыё».***

Першая такая акцыя запланаваная на дзень сьв. Валянціна, а потым яе зьбіраюцца прымяркоўваць да сьвятаў — Новага году, Дня маці ды інш. Супрацоўнікі Чырвонага Крыжа цяпер абіраюць пары, якія запачаткуюць новую традыцыю.

Паводле Галіны Жаланавай, дзеткі зь дзіцячага дому пасьля такіх візытаў павінны зразумець, што сям’я — гэта добра і прыгожа, а маладыя, на самым пачатку сямейнага жыцьця наведаўшы дзіцячы дом, задумаюцца пра сямейныя каштоўнасьці.

КУЛЬТУРА

## «Be2gether» абапал мяжы

***Арганізатары найбуйнейшага балтыйскага фэстывалю рок-музыкі «Be2gether» маюць намер правесьці наступны фэст па абодва бакі летувіска-беларускай мяжы, паведаміў заснавальнік і генэральны прадусар «Be2gether» Гендрус Клімкявічус, піша «Наша Ніва».***


photo.bymedia.net

«Мы хочам, каб жыхары абедзьвюх краінаў маглі ў роўнай ступені атрымаць асалоду ад музыкі, бо сам лёзунг фэстывалю гучыць так: «Музыка адчыняе межы», — распавёў Гендрус Клімкявічус.

Паводле словаў амбасадара Летувы ў Беларусі Эдмінаса Багдонаса, адну сцэну мяркуецца разьмясьціць на тэрыторыі Летувы, а другую — у Беларусі.

Да канца году арганізатары фэстывалю зьбіраюцца абмеркаваць ідэю правядзеньня такога канцэрту зь беларускім бокам. Эдмінас Багдонас паведаміў, што ягоны беларускі калега Ўладзімер Дражын «пазытыўна выказаўся пра наша жаданьне».

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.